РАБОТНІКІ НАВУКІ І ВЫШЭЙШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ!
ЗМАГАЙЦЕСЯ ЗА ДАЛЕЙШЫ РОСКВІТ НАВУКІ, ЗА ТЭХНІЧНЫ ПРАГРЭС!
РЫХТУЙЦЕ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ, ВАРТЫХ ЭПОХІ КАМУНІЗМА!

(З заклікаў ЦК КПСС да 48-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі).

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 31—32 (619—620) Пятніца, 5 лістапада 1965 г. Год выдання XVIII Цана 2 кап.

ВІНШУЕМ СТУДЭНТАЎ, ВЫКЛАДЧЫКАЎ І СУПРАЦОЎНІКАЎ СА СВЯТАМ ВЯЛІКАГА КАСТРЫЧНІКА.

## СВЯТЛО КАСТРЫЧНІКА

Пераможна і ўладарна крочыць па зямлі Кастрычнік. У святочным убранні родная Савецкая зямля — гарады і сёлы, заводы і фабрыкі, гмахі новабудоўляў і абжытых шчасцем дамоў. Чырвоныя палотнішчы развявае вецер, як і ў тыя памятныя дні 48 гадоў таму назад. Пурпуровае іх святло, як водбліск зары, што разняла свае крылы над усёй краінай у памятны 1917 год.

Дарагі сябра і таварыш! Паглядзі навокал: з кожным годам маладзее і прыгажэе наша вялікая Савецкая Радзіма, наша Беларусь!

Полацкі нафтаперапрацоўчы... Салігорскі калійны камбінат... Гродзенскі азотна-тукавы... Гомельскі суперфасфатны — шляхі працоўных подзвігаў народа.

Абнаўляецца аблічча вёскі, растуць поспехі яе працаўнікоў, плён нашых палёў, нястомных рук іх слаўных гаспадароў.

Сярод тых, хто будуе і сее, працуе на заводах і ў школах, у лабараторыях і ВНУ, вы знойдзеце людзей, якія скончылі і універсітэт імя Ул. І. Леніна.

Народжаны рэвалюцыяй, створаны па асабістаму ўказанню Уладзіміра Ільіча Леніна, наш універсітэт выхоўвае высокакваліфікаваных спецыялістаў. Дзякуючы пастаяннаму клопату партыі і ўрада, Беларускі Дзяржаўны універсітэт стаў буйнейшым навуковым цэнтрам. У 1949 годзе, у дзень вялікага свята беларускага народа — 30-годдзя стварэння БССР — нашаму універсітэту было прысвоена імя Уладзіміра Ільіча Леніна. Гэта вялікі гонар насіць імя правадыра рэвалюцыі. Гэта разам з тым да многага абавязвае. Поспехамі ў навуцы, выдатнай вучобай мы павінны кожны дзень апраўдваць высокую годнасць нашай установы, якая носіць імя дарагога Ільіча.

Яшчэ зусім свежы ў памяці той святочны дзень, калі мы пераступілі парог галоўнага корпуса універсітэта, а ўжо новы падарунак чакае нашых студэнтаў — неўзабаве гасцінна адкрыюцца дзверы новага корпуса для факультэта радыёфізікі і электронікі. Вядуцца работы па ўзвядзенню будынка новага хімічнага корпуса.

Нашы лабараторыі абсталяваны найноўшымі прыборамі, якія дазваляюць вырашаць складаныя задачы навукі. У прасторных аўдыторыях, кабінетах, чытальнях і спартыўных залах створаны ўсе ўмовы для паспяховага навучання студэнтаў.

І таму кожны з нас нясе ў сэрцы словы ўдзячнасці Вялікаму Кастрычніку, вернасць яго ідэалам — ідэалам партыі вялікага Леніна.




*Ніл ГІЛЕВІЧ*

## Песня аб партыі

*З табою на шлях перамогі*
*Мы выйшлі ў суровых баях.*
*Заклалі падмурак эпохі,*
*Нязломны, як воля твая.*
*З табою наш край стаў заможным,*
*Багаццяў не злічыш усіх.*
*Мы бачым у подзвігу кожным*
*Бяссмерце рашэнняў тваіх.*
*У шахтах, у цэхах, у полі*
*Працуем братэрскай сям'ёй.*
*З дарогі не збіць нас ніколі —*
*Мы ўзброены праўдай тваёй.*
*Мы помнім змаганні за шчасце,*
*На варце нядрэмна стаім,*
*Віхуры нам вочы не засцяць —*
*Мы пільныя зрокам тваім.*
*Для міру пакораны атам*
*Палае над нашай зямлёй.*
*Пад ленінскім сцягам крылатым*
*Мы дужыя сілай тваёй.*
*Да зораў шляхі пракладае*
*Тваіх арлянятаў сям'я,*
*Іх смелае племя ўзлятае*
*Высока, як слава твая.*
*Ты наша і чэсць, і сумленне,*
*І вера, якой мы жывём.*
*З табою для ўсіх пакаленняў*
*Мы светлае шчасце куём!*

2 лістапада адбылася справаздачна - выбарная прафсаюзная канферэнцыя супрацоўнікаў універсітэта. Даклад аб рабоце мясцкома зрабіў А. Ул. Царук, са справаздачай рэвізійнай камісіі выступіў І. Галаваты. Былі выбраны новы мясцком, рэвізійная камісія, таварыскі суд. Больш падрабязна аб канферэнцыі мы раскажам у бліжэйшым нумары.

# КРЫЛЫ БУДУ СНІЦЬ І ВЫШЫНЮ

* * *

**Мар'ян ДУКСА**

*Як урач, выслухваю сябе я.*
*Думаю —*
*Не варыць галава:*
*І чаму дагэтуль не сталею,*
*Хоць адгрукатала дваццаць два.*

*У жыццё не апусціў карэнні,*
*За душой не маю ні граша,*
*Несур'ёзны, трохі легкадумны(?)*
*І для ўсіх адкрытая душа.*

*Мусіць, так я і пайду падлеткам*
*Па жыцці — наіўным хлапчуком,*
*Закаханым у расу і кветкі,*
*І бусліны клёкат на сялом.*

*Мараю вялікаю натхнёны,*
*Крылы буду сніць і вышыню*
*І навокал пазіраць здзіўлёна,*
*Быццам бачу свет упершыню.*

* * *

*Як зараснік аеру,*
*Што шэпча за кустамі,*
*Ты рассуваеш цемру*
*Маленькімі рукамі.*

*Ступаю асцярожна,*
*Шчаслівы я без меры:*
*Ты мне бездапаможна*
*Сваю руку даверыла.*

*Над галавой у цішы*
*Лапочуць крыллем птахі.*
*Ты слухаеш, стаіўшыся,*
*Усе лясныя жахі.*

*А ночка сіне-цёмная...*
*(Дзяўчаты вы, дзяўчаты!)*
*Праз ноч, як пекла чорнае,*
*Вяду цябе дахаты.*



**Уладзімір ДЗЮБА**

## Табун

Мне ніхто не крычаў,
не падказваў мне:
— Вунь!
На мяне,
праз мяне
нёсся конскі табун.

Нават горкі палын
на імгненне прылёг.

І не мог я злічыць
колькі цокала ног.
Ускапычаны стэп,
як шалёны,
скакаў.
І, як медзь,
зіхацеў
пыл на конскіх баках.

Знік за даллю табун...
А ўявіць і не змог,
як не збіла мяне
столькі ног,
столькі ног!



Рысункі М. Татарцава.

**Мікола ВЯРШЫНІН.**

## Асабісты прыклад

«Алкаголь — прычына гора
І крыніца дрэнных з'яў.
Ад яго, ад алкаголя
Шмат бывае брыдкіх спраў».

Тут, вады глынуўшы крыху,
Лектар бурна вёў працяг:
«Алкаголь— такое ліха!
Гэта, прама скажам, жах.

Труціць печань, нервы, сэрца,
Злосць выказвае сваю,
А яшчэ, сябры, паверце,
Разбурае ён сям'ю.

Самі ў гэтым вінаваты. —
І пакута тут і боль;
Каб чым-небудзь — хоць гарбатай—
Замянілі алкаголь.

Гэта б так было цудоўна,
Так бы кожны чалавек
Мог падоўжыць, безумоўна,
На дзесятак год свой век».

Пасля лекцыі дахаты
Стаў збірацца лектар мой.
Двое хлопцаў зухаватых
Разам з ім пайшлі дамоў.

«Вы, як бачна, добры лектар,
Будзем памятаць вас век.
А яшчэ, казаў нам нехта,
Вы нядрэнны чалавек.

Вось вы нам ужо знаёмы,
І таму сягоння вас
Пачастуем... каньячком мы...»
Лектар кажа ў адказ:

«Колькі зорачак на небе,
Не палічыш іх, сябры.
Але мне так шмат не трэба,
Даражэй за ўсё мне... тры.

Што ж, памочым трошкі губы,
Бо спяшацца нам не след,
Вып'ем з гора, дзе ж той кубак?, —
Як пісаў адзін паэт».

Хлопцы выпілі па дзвесце,
Лектар шклянку асушыў
І... закоўзаўся на месцы,
Вокліч вырваўся з душы:

«Што ж вы мне гарбаты далі,
Хіба ж я не чалавек?!»
Хлопцы дружна адказалі:
«Хочам вам прадоўжыць век!».

Думка просценькая ў вершы:
Сам не робіш — не кажы.
Агітуй другіх, ды першы
Прыклад іншым пакажы!..

**Ларыса КОЛАБАВА**

А б каханні пісаць
Мо не трэба?
Можа гэта —
Збітая тэма?

Ці не лепей
Пра космас і неба,
Пра горы
Жытняга хлеба.

Ды што зробіш:
Сямнаццаць маю
І хлапца я
Усім сэрцам кахаю.

—о—

**Ніна ЛОЙКА**

**Мне б вясёлку з неба**
**дастаць,**
**Да аблокаў чыстых**
**кранацца.**
**Над зямлёй усёй**
**пракрычаць:**
**Мне 17, мне 17!**

**Пабываць сярод гор і пустынь,**
**З гулкім рэхам пераклікацца,**
**Аж да снежных данесці**
**вяршынь**
**17, свае 17!**

**І хачу я на роднай зямлі,**
**Каб луналі ўсмешкі юнацтва,**
**Каб шчаслівa кахалі, жылі**
**Усе тыя, каму 17!...**

**Леакадзія КАЖУХОЎСКАЯ.**

**Я шукала цябе ў квецені,**
**У халоднай, крынічнай**
**вадзе.**
**Мне ж падказваў вясновы**
**вецер,**
**Што ты лесам недзе ідзеш.**

**Бегла ў лес я праз хаты і гумны,**
**У бярозак пытала і хвой.**
**У адказ жа чулася сумнае:**
**— Так, праходзіў, але не твой.**

**Можа гэта вясна-гарэзніца**
**Завяла ў непраходны гай,**
**Закружыла цябе ў бярэзніку?..**
**Ты ж мне толькі голас падай!..**

**І хаджу я з надзеяй і верaю,**
**Што вось-вось ты мяне гукнеш:**
**Проста ты заблудзіўся ў верасні,**
**А ў кастрычніку знойдзеш мяне.**

* * *

**Светлае, светлае ранне**
**Кінула промні ў акно,**
**Выйдзі, маё каханне,**
**Слова скажы хоць адно.**

**Помніш, як буйныя росы**
**Сонца дарыла нам,**
**Помніш, як светлыя косы**
**Вуснамі ціха кранаў?**

**Сёння ж твая дачушка**
**Стрэла мяне ля варот.**
**Голас, як твой—прыглушаны,**
**Тых жа брывей узлёт,**

**Той жа прыгожы тварык,**
**Што бачыў не раз у сне,**
**Вочы ж чамусьці—карыя,**
**Вочы — чужыя мне!..**

—о—

**Міхась ГУБЕРНАТАРАЎ.**

Эх ты, восень,—густыя ліўні
І сям'я плакучых бяроз,
Што пакінута бацькам-
жніўнем —
Жменя горкіх на голлі слёз.

Ды бярозкам яшчэ не верыцца,
Што іх восень даўно, даўно
Аддала ў парабчанкі верасню—
Біць паклоны яму да ног.

Мусіць, сёння яшчэ ім сніцца,
Як пасватаўся калісь май,
Хоць у белай ідзе спадніцы.
Бы свякрова, сама зіма.



**Юрка ГОЛУБ.**

Бульба — згустак схаваңай
сілы,
Што цемру растком асіліў!
Бульба—роднае, наскае,
Што пахне гасцінаю, ласкаю.

З бульбы ў каляным прысаку
Галавешкай іскры высеку!
Яе на полі ледзь плугам
пераваліо..
Бульбу—люблю!...

*Кнігі твайго выкладчыка, студэнт!*

## ЯК УЗНІКЛА ПІСЬМО?

У выдавецтве «Вышэйшая школа» выйшла з друку кніга М. А. Пауленкі «Кароткі нарыс гісторыі пісьма». Яна рэкамендуецца як дапаможнік для філалагічных факультэтаў універсітэтаў і падінстытутаў. Кніга напісана цікава, яна захапляе чытача, расказваючы аб найвялікшым здабытку чалавечай культуры —вынаходстве і развіцці пісьма.

Разам з гэтым праца М. А. Пауленкі вызначаецца багаццем фактычнага матэрыялу. Аўтар абапёрся на выніку шматлікіх даследаванняў, прысвечаных гэтай тэме. А трэба сказаць, што бібліяграфія па гісторыі пісьма налічвае не адну сотню назваў і далёка не вычэрпваецца рэкамендаванай літаратурай, што прыведзена ў канцы кнігі, і, вядома, мае іншую мэту — гэта першы павадыр у вялікае мора літаратуры па гісторыі пісьма.

Каштоўнасць рэцэнзіруемай кнігі і ў тым, што ў ёй падаецца нарыс гісторыі беларускай графікі.

Кніга багатая на табліцы і ілюстрацыі. Старанна падабраныя аўтарам, яны ажыўляюць кнігу, аблягчаюць яе ўспрыманне, даюць чытачу мажлівасць і зрокам прасачыць зменлівасць і поступ гісторыі пісьма.

Няма сумнення, што гэта кніга будзе цікавай не толькі для спецыялістаў-філолагаў, але і для шырокага кола чытачоў.

**П. ШУБА,**
**дацэнт кафедры беларускай мовы.**

## «КРАЯВЫЯ ЗАДАЧЫ»

**Кніжка доктара фізіка-матэматычных навук прафесара нашага універсітэта Фёдара Дзмітрыевіча Гахава «Краявыя задачы» не залежваецца ў кнігарні.**

**За параўнаўча кароткі час яна выдавалася двойчы, і хутка разыходзілася, і па гэтым ужо можна меркаваць аб яе патрэбнасці і важнасці.**

**Цяжка выкладаць змест навуковай матэматычнай кніжкі не для спецыялістаў-матэматыкаў, але паспрабую. Уласцівасць многіх фізічных аб'ектаў апісваецца так званымі дыферанцыяльнымі ураўненнямі. Звычайна вядомы іх паводзіны на мяжы пэўных фізічных абласцей, а невядомымі застаюцца ўнутры з'яў. Так у матэматычнай фізіцы ўзнікаюць краявыя задачы: у некаторай частцы прасторы знайсці рашэн. не зададзенага дыферанцыяльнага ўраўнення, якое здавальняла б на мяжы пэўнага стану пэўнай умовы. Калі ў сілу сіметрыі з'ява не залежыць ад аднаго вымярэння, то можна разглядаць справу так, нібы ўсё адбываецца на плоскасці. Рашэнню такіх вось задач і прысвечана кніга Ф. Д. Гахава. У якасці сродкаў для іх рашэння выкарыстоўваецца добра распрацаваны, шырокі апарат тэорыі функцый комплекснага пераменнага.**

**Вялікую ўвагу аўтар звяртае на яснасць і даходлівасць выкладання. Пагэтаму кніжка карыстаецца вялікай папулярнасцю не толькі сярод матэматыкаў, але і механікаў, фізікаў, якія з розных канцоў краіны прыязджаюць да Фёдара Дзмітрыевіча, каб атрымаць паглыбленую кансультацыю.**

**Работа Ф. Д. Гахава атрымала шырокае прызнанне не толькі ў нашай краіне, але і за рубяжом. Яна перакладзена на англійскую мову, і хутка выдавецтва «Пергамон Прэс» выдасць яе.**

**В. І. СМАГІНА, кандыдат фізіка-матэматычных навук.**

Рэдактар А. ЛОЙКА.

АТ 03519 Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19. Друкарня Выдавецтва «Звязда» Тыр. 2000. Зак. 1195.